УДК 821.112.2+821.161.3

А. Л. Батурына

Навук. кір. – І. Ф. Штэйнер, д-р філал. навук, прафесар

# ВОБРАЗЫ ЧАРАЎНІКОЎ У НЯМЕЦКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ РАМАНТЫЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці ўвасаблення вобразаў чараўнікоў у творах нямецкіх рамантыкаў і прадстаўніка 15 рамантычнай плыні ў літаратуры Беларусі XIX ст. Я. Баршчэўскага. Цікавасць да чароўнага з‶яўляецца адной з універсальных прыкмет рамантызму. На матэрыяле шэрагу празаічных твораў вылучаецца агульнае і адметнае ў ідэйным змесце вобразаў чараўнікоў у творах нямецкіх рамантыкаў і Я. Баршчэўскага.

Зварот да фантастыкі ў мастацтве выявіў крызіс рацыяналістычнага светабачання перыяду Асветніцтва. Яшчэ ў перадрамантычны перыяд, на мяжы XVIII і XIX стагоддзяў, у Еўропе набывае папулярнасць англійскі гатычны раман, нямецкія паэты, прадстаўнікі напрамку «Бура і націск», ствараюць «жахлівыя балады» («Ленора» Г. Бюргера (1743), «Лясны цар» (1778), Й. В. Гѐтэ). Вольная, нічым не абмежаваная фантазія стала асновай творчага метаду рамантыкаў, і таму фантастычныя сюжэты і вобразы зрабіліся адметнай рысай рамантызму. Развіццѐ фантастыкі ў нямецкай рамантычнай літаратуры было абумоўлена ўплывам філасофскага ідэалізму (Шэлінг, Фіхтэ) з адухаўленнем прыроды і разуменнем свабоднай мастацкай фантазіі як асновы творчасці, а таксама цікавасцю да фальклору, дзе ключавыя пытанні быцця – сутнасць і сэнс чалавечага жыцця, маральныя нормы суіснавання людзей, нараджэнне і смерць – асэнсоўваліся праз сістэму фантастычных вобразаў і сюжэтаў. Фантастычнае ў рамантызме паўстае як неад'емная глыбінная частка існага, нярэдка як адзіна праўдзівае быццѐ, свабоднае ад карысталюбства і ганарыстасці. Фантастыка давала аўтарам магчымасць ва ўмовах палітычнага ціску і цэнзурных абмежаванняў закранаць вострыя нацыянальныя і сацыяльныя праблемы, якія хвалявалі грамадства. Нярэдка фантастыка, даведзеная да гратэску, была інструментам рамантычнай іроніі. На думку М. В. Хаўстовіча, «сімволіка, умоўнасць, гратэск у мастацтве з'яўляюцца для рамантыкаў не самамэтай, а сродкам напаўнення мастацкіх вобразаў пафасам нацыянальнага (і іншага) зместу. У сімвалічных, умоўных формах яны адлюстроўвалі імкненне да свабоды народа і асобы» [1, с. 80] У рамантычных творах ролю правадыра ў свет фантастыкі выконваюць героі, надзеленыя незвычайнымі здольнасцямі – магі і чараўнікі. Яны яднаюць рэальны свет і свет фантазіі, таму іх вобразы часта адыгрываюць ключавую ролю пры дэшыфроўцы ідэйнага зместу рамантычнага твора. Магі і чараўнікі ў раннім рамантызме з'яўляюцца персаніфікацыяй таямнічых сіл, якімі, на думку рамантыкаў, прасякнута ўсѐ існае, уся прырода. Старая з казачнай навелы Л. Ціка «Бялявы Экберт» і Лясная Жанчына (навэла Литературоведение 16 «Рунэнберг») – загадкавыя, магічныя істоты, не добрыя і не злыя; яны амбівалентныя, як прырода. Гібель герояў Ціка (Берты, Экберта і Крысціяна) не абумоўлена варожасцю да іх з боку чараўніц. Героі самі нясуць адказнасць за свой трагічны лѐс, паколькі сталі ахвярай варожых сіл пасля ўласнай памылкі: свядомага парушэння маральных законаў (Берта скрала птушку і каменні ў таямнічай старой, Экберт забіў сябра) ці нежадання падпарадкавацца традыцыйнай плыні жыцця (Берта адмаўляецца ад самотнага жыцця ў лесе; Крысціян спачатку не жадае працягваць справу бацькі-садоўніка, а потым губляе цікавасць да сваѐй сям'і і гаспадаркі). Чароўныя сілы ў гэтых творах паўстаюць як увасабленне непазбежнасці лѐсу, пакарання за грахі. Чараўнікі ў творах Навaліса, Ціка, Айхендорфа засяляюць горы і лясы. Іх цесная сувязь з рамантычнай канцэпцыяй прыроды праяўляецца і ў іх здольнасці змяняць уласнае аблічча (Старая – гэта адначасова і Вальтэр, і Гуга), яны могуць быць прыгожымі і пачварнымі (Горная Прыгажуня ў фінале з'яўляецца ў выглядзе агіднай Лясной Жанчыны). Э. Т. А. Гофман у сваіх казках супрацьпастаўляе чароўную прыроду і празаічную сучасную цывілізацыю. Магам і феям Гофмана не знаходзіцца месца ў свеце, дзе чалавек імкнецца падпарадкаваць сабе прыроду, дзе пануюць рацыяналізм і прага золата. У цывілізаванай краіне, дзе ўведзена асвета,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якую ўлады разумеюць як неабходнасць «знішчыць лясы, зрабіць раку навігацыйнай, разводзіць бульбу, палепшыць вясковыя школы, пасадзіць акацыі і таполі, навучыць моладзь спяваць на два галасы ранішнія і вячэрнія малітвы, праклaсці шасэйныя дарогі і прышчапіць воспу» [2, с. 6], славутая на ўвесь свет фея Розабэльвэрдэ (казка «Курдупель Цахес») вымушаная пад гнѐтам абставін весці празаічнае жыццѐ патронкі прытулку паненкі Розеншен. Але Гофман папярэджвае свайго чытача: нельга пыхліва верыць у неабмежаваныя магчымасці чалавечага розуму. У казцы ірацыянальнае помсціць рацыянальнаму: пад уздзеяннем чараў феі цвярозыя і разумныя людзі трапляюць пад уладу пачварнай істоты, курдупеля Цахеса, які мае незвычайныя здольнасці падпарадкоўваць сябе людзей. І перамагчы ірацыянальнае зло магчыма толькі з дапамогай любові і фантазіі, якія ўвасабляюцца ў гэтай казцы ў вобразах студэнта-паэта Бальтазара і мага Праспэра Альпануса. Калі для ранніх рамантыкаў пад ўплывам натурфіласофіі Шэлінга прырода была ўвасабленнем Бясконцага, Боскага, то з пераарыентацыяй нямецкіх рамантыкаў на традыцыйнае каталіцтва чароўнае ў прыродзе нярэдка супрацьпастаўляецца цуду ў хрысціянскім разуменні. У навэле А. фон Арніма «Ізабэла Егіпецкая» матэрыя ўвасабляецца ў вобразе альраўна, а 17 нематэрыяльнае – у прыгожай і самаахвярнай цыганцы Ізабэле. [3, с. 225] Карыслівы, брыдкі і абмежаваны Карнэлі Непот, а на самой справе ажыўлены чарамі корань расліны мандрагора, з'яўляецца персаніфікацыяй прыроднага, матэрыяльнага. Ён валодае магічнай здольнасцю здабываць скарбы. Нягледзячы на сваю знешнюю непрывабнасць і дурноту, ѐн выдатна прыстасаваны да жыцця ў соцыуме, дзе галоўнай каштоўнасцю з'яўляецца золата. (менавіта рысы Карнэлія Непота пазней атрымаў узгаданы вышэй гофманаўскі Цахес-Цынобэр) Што тычыцца Ізабэлы, то яна стварае цуд – ратуе свой народ, вяртае яго з выгнання на радзіму не з дапамогай магіі, а праз наіўную самаахвярнасць. Яна адмаўляецца ад бліскучай ролі каханкі будучага імператара Карла, не можа прымірыцца з тым, што для Карла матэрыяльныя інтарэсы вышэй за духоўнае. Чароўнае таксама звязана ў рамантызме з паганскім, антычным. Адзін з улюбѐных матываў рамантыкаў – гісторыя Тангейзера, мінэзінгера, які трапіў пад ўздзеянне чар Венеры і застаўся на доўгія гады ў яе гроце. Да яе звярталіся Л. Цік у казцы «Верны Экарт і Тангейзер», Й. фон Айхендорф у творах «Восеньскія чары» і «Мармуровая статуя», Э. Т. А. Гофман у апавяданні «Спаборніцтва музыкаў». Позні рамантык Айхендорф выразна супрацьпастаўляе разбуральнасць чар Венеры (сімвал імкнення да бездухоўнай асалоды, плоцевых уцех) і выратавальны цуд хрысціянскай веры, да якой звяртаюцца галоўныя героі ў пошуку апірышча. У галоўным творы Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» вобразы чараўнікоў займаюць важнае, часам цэнтральнае месца ў развіцці сюжэта. Большасць чараўнікоў звязаныя з цѐмнымі сіламі, а магічнае паўстае як варожае людзям і антыхрысціянскае. У гэтай сувязі выключэннем з'яўляецца вобраз «чараўніка ад прыроды» селяніна Тамаша, які «нейкім таемным словам хутка вяртаў ім [хворым] здароўе і спакой» [4, с. 259]. Тамаш здольны выганяць з галоў паноў і паненак вос, матылѐў і іншых «жахлівых пачвараў» [4, с. 269], якія завяліся там ад варкатання д'ябальскага ката Варгіна. Гэту алегарычную гісторыю магчыма зразумець у наступным сэнсе: скажоныя ўяўленні пануючага класа аб рэальным жыцці, іх маральныя заганы можа вылечыць праз судакрананне з мудрасцю людзей «ад прыроды», не разбэшчаных сучаснай цывілізацыяй, перш за ўсѐ простых сялян. Але большасць чараўнікоў не дапамагае, а шкодзіць простаму чалавеку. Пры стварэнні іх вобразаў Баршчэўскі нярэдка звяртаецца да фальклору. Так, ведзьмы ў народнай фантазіі часта крадуць малако ад чужых кароў. У гэтым сяляне падазраваюць Арыну («Зухаватыя ўчынкі») і Праксэду («Радзімы знак на вуснах»). Цікава, што ў Литературоведение 18 крадзяжы малака сяляне абвінавачвалі і гофманаўскую фею Розабэльвэрдэ. Баршчэўскі часта падкрэслівае, што чараўнік альбо чараўніца – чужынцы сярод тутэйшых: Чарнакніжнік з апавядання «Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем» «з'явіўся … невядома адкуль» [4, с. 27], яго ж мы пазнаѐм і ў апавяданні «Валасы, якія крычаць на галаве». Арыну з сям'ѐю «пан прывѐз з-за свету, жылі далѐка за Дзвіною» [4,с. 62]. І Праксэда не належыць да сялянскай грамады: муж яе аканом, а яна карчмарка, жыве паасобку ад сялян. Асташкоўцы, якія нішчаць рыбу ў навакольных азѐрах і маюць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стасункі з д‘яблам, таксама чужынцы. Асобная роля ў зборніку адведзена вобразу чарнакніжніка. У сваім грунтоўным даследаванні творчасці Я. Баршчэўскага М. Хаўстовіч ставіць знак роўнасці паміж чарнакніжнікам і д‘яблам і тлумачыць стасункі з чарнакніжнікам як пераход героя на бок антынацыянальных сіл, здраду сваім [1, с. 106]. Але вельмі важна вызначыць, якую ідэалогію прыносіць у край чарнакніжнік: гэта перш за ўсё адмаўленне ад веры і старых звычаяў. Чорны старац, які загубіў Амелію («Валасы, якія крычаць на галаве»), так кажа пра сябе: «заўсѐды змагаюся з забабонамі і людскімі выдумкамі … ведаю ўсе чалавечыя патрэбы, дазнаўся пра самыя пакрыѐмныя таямніцы прыроды, хацеў прынесці палѐгку жыхарам гэтай неўраджайнае і ўбогае краіны» [1, с. 207]. Тут лѐгка пазнаць філасофію часоў Асветніцтва, якая, на думку аўтара, прынесла вялікую шкоду краю, пераўтварыўшы значную частку панства ў «недаверкаў і фармазонаў». У апавяданні «Твардоўскі і вучань» Баршчэўскі ў алегарычнай форме паказаў працэс страты веры вышэйшымі пластамі грамадства. Шлях Твардоўскага – адукаванага чалавека, настаўніка моладзі – да продажу душы д‘яблу пачынаецца з чытання забароненых кніжак, якія навучылі яго не баяцца смяротных грахоў. Такім чынам, для аўтара адукацыя без рэлігіі, выхаванне ў духу рэлігійнага скептыцызму, якое прынесла Асветніцтва, – гэта «чарнакніжніцтва». Баршчэўскі сцвярджае, што калі юнак трапіць пад уплыў бязбожнай адукацыі, то яго душа незваротна гіне, як загінула душа Гугона, вучня Твардоўскага. Асабліва небяспечна, калі юнак, у целе якога жыве злы дух, зробіцца «суддзѐю, сакратаром або іншым чыноўнікам» [4, с. 179], бо «чалавек без рэлігіі на ўсѐ гатовы» [4, с. 29]. Замест духоўных каштоўнасцей злыя чараўнікі – чарнакніжнікі, Белая Сарока і іх паплечнікі, прапануюць матэрыяльны дабрабыт, грошы. Навошта ім гэта? «Мы здзівім свет», – гаворыць Агапцы незнаѐмец-Цмок [4, с. 41], каб спакусіць іншых людзей і вымусіць іх забыць старыя традыцыі і мараль. 19 Такім чынам, аналіз вобразаў магаў і чараўнікоў у нямецкай і беларускай рамантычнай літаратуры дазваляе зрабіць наступныя высновы. У рамантычных творах чараўнікі выконваюць ролю правадыра ў свет фантастычнага і ірацыянальнага. Магічнае паўстае як частка прыроды, патаемных сіл, якімі прасякнута ўсѐ існае. Рамантыкі палемізуюць з філасофіяй Асветніцтва, ставячы пад сумненне дасягненні цывілізацыі. Пры звароце рамантыкаў да традыцыйнага каталіцтва чароўнае супрацьпастаўляецца цуду ў хрысціянскім разуменні і нярэдка набывае негатыўны сэнс. Параўнанне вобразаў чараўнікоў у творчасці нямецкіх рамантыкаў і Я. Баршчэўскага дазваляе вылучыць шэраг агульных рыс у светапоглядзе апошняга і рамантыкаў гейдэльбергскай суполкі: арыентацыя на традыцыйнае хрысціянства, супрацьпастаўленне прыродна-матэрыяльнага і духоўна-рэлігійнага. З Гофманам Я. Баршчэўскага яднае крытычнае стаўленне да дасягненняў Асветніцтва і сумненне ў неабмежаваных магчымасцях рацыянальнага чалавечага розуму. Спіс літаратуры 1 Гофман, Э. Т. А. Курдупель Цахес, якога звалі Цынобэр: казка; Рыцар Глюк; Дон Жуан: навелы / Э. Т. А. Гофман. - пер. з нямецкай [В.Сѐмухі]. – Менск [Мінск], 2008 – 209 с. 2 Федоров, Ф. П. Художественный мир немецкого романтизма: Структура и семантика / Ф. П. Федоров. - М: МИК, 2004. - 368 с. 3 Хаўстовіч, М. В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага і развіццѐ беларускай літаратуры 30-40-х г.г. XIX ст. : дыс. … доктара філалагічных навук : 10.01.01 / М. В. Хаўстовіч. – Мінск, 2003. – 222 с. 4 Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 383 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ